Такім чынам, гукаперайманне выступае важкім эўфанічным сродкам, які падмацоўвае многія асацыяцыі, дапамагае стварыць дакладныя малюнкі рэчаіснасці, адлюстроўвае сэнсавае напаўненне гукаў маўлення.

**Літаратура**

1 Станкевіч, А. А. / Лінгвістычны аналіз тэксту: вучэбны дапаможнік / А. А. Станкевіч; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – 198 с.

2 Сцяцко, П. У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. – Мінск : Выш. шк., 1990. – 222 с.

3 Рагойша, В. П. Гукаперайманне / В. П. Рагойша // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск : Беларусь. Сав. энцыклапедыя, 1985. – Т. 2. – С. 226–227.

4 Рагойша, В. П. Гутарка пра верш: Метрыка. Рытміка. Фоніка / В. П. Рагойша. – Мінск : Нар. асвета, 1979. – 128 с.

5 Дранько-Майсюк, Л. Гаспода: выбранае / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 382 с.

6 Дранько-Майсюк, Л. / Цацачная крама: кніжка для вялікіх і малых Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 59 с.

7 Торра В. А. Эўфанічныя сродкі моўнай выразнасці ў паэзіі Рыгора Барадуліна : дыс. … канд. філ. навук : 10.02.01 / В. А. Торра. – Гомель, 2006. – 110 с.

**УДК 811.161.3’42:821.3’06**

***М. С. Язерская***

## ІНФЕРНАЛЬНАЯ ВАНДРОЎКА ЯК ТЭКСТАЎТВАРАЛЬНЫ МАТЫЎ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле на прыкладзе казкі “Падарожжа ў пекла” Я. Маўра і аповесці “Лабірынты” В. Ластоўскага разглядаюцца мастацкія функцыі матыву інфернальнай вандроўкі. Аўтар прыходзіць да высновы, што яго значэнне ў структуры тэксту залежыць ад адрасата твора, агульнай праблематыкі і вобразна-сімвалічнага напаўнення інфернальнай прасторы (пекла, лабірынт), а таксама пра цесную сувязь гэтага матыву з міфалогіяй – славянскай, антычнай, біблейскай.*

У сучасным разуменні паняцце “інфернальны свет” значыць невядомы і недасяжны для жывых людзей. Існуе каласальная колькасць прыкладаў апісання ў літаратурных творах гэтай нябачнай прасторы. “Першым такім вандроўцам быў шумерскі каралевіч Гільгамеш, герой неймаверна старажытнага эпасу, занатаванага пяць тысячаў год таму на гліняных таблічках. Ён вандраваў у апраметную з надзеяй выратаваць свайго сябру, «дзікага чалавека» Энкіду” [1, с. 43], – зазначае П. Васючэнка. У гэты спіс можна ўключыць “Боскую камедыю” Дантэ Аліг’еры, раман “Майстар і Маргарыта” М. Булгакава, зборнік “Экзістэнцыяльны тэатр” Ж. П. Сартра, аповесць “Вандроўка капітана Стормфілда ў рай” М. Твэна і шмат іншых. Яшчэ ў XIX стагоддзі ў беларускай літаратуры містычныя падарожжы здзяйснялі героі Я. Баршчэўскага (апавяданне “Жабер-трава” з кнігі “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”), К. Вераніцына (паэма “Тарас на Парнасе”), Ф. Багушэвіча (балада “Быў у чысцы”) і інш. У мінулым стагоддзі да твораў з матывамі падарожжа ў патубаковы свет



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дадаліся аповесці “Лабірынты” В. Ластоўскага і “Ладдзя Роспачы” У. Караткевіча, а таксама казка “Падарожжа ў пекла” Я. Маўра.

Усе гэтыя творы па сваёй ідэйнай скіраванасці і стылі даволі розныя, але аб’ядноўвае іх тое, што ў кожным так ці інакш ёсць узаемадзеянне з інфернальным светам. Так, напрыклад, у адрасаваным дзіцячай аўдыторыі творы Я. Маўра “Падарожжа ў пекла” два хлопцы, піянеры Янка Гуж і Юрка Пыж, вырашылі наведаць апраметную, каб паглядзець што і як там адбываецца. У працэсе вандроўкі хлопцы сутыкаюцца з вялікай колькасцю праблем і знаходзяць шмат незразумелага. Твор, згодна з ідэалагічнымі патрабаваннямі часу, мае дыдактычна-атэістычную скіраванасць, што праглядаецца на ўсіх ўзроўнях разгортвання сюжэта.

Спачатку героі з цяжкасцю адшукваюць шлях да самога пекла, апытаўшы ўсіх сустрэчных. І толькі адзін “мясцовы дурань” Кандрат указаў ім правільны кірунак: “Трэба ўначы пайсці проста ў лес, потым завярнуць направа, потым налева, далей зноў направа, тады зноў налева і яшчэ раз налева. Там сярод вялікіх каменняў стаіць стары дуб з шырокім дуплом. Трэба дачакацца поўначы і тады можна лезці ў дупло – вось вам і дарога. У даўнейшыя часы адтуль заўсёды чэрці вылазілі; толькі цяпер іх чамусьці не чуваць” [2]. Хлопцы кінуліся ў лес, і, кіруючыся інструкцыямі Кандрата, апынуліся ля ракі Стыкс, адкуль да чарцей засталася адлегласць усяго толькі ў 5460 кіламетраў. Як бачым, Я. Маўр у апісанні патубаковай прасторы апелюе да сінтэзу біблейскай, славянскай і антычнай міфалогіі.

У мастацкай рэчаіснасці твора пекла зусім не тое, якім яго звычайна малююць. У чарцей няма ўжо таго энтузіязму, як раней, бо бязбожнікаў прыбывае ўсё больш: “А калі прымем яшчэ пад увагу, што цяпер народ наогул сапсаваўся і не надта імкнецца ў рай, што за адны толькі суткі на зямлі паміpae каля 120 000 чалавек, тады мы з дапамогай вышэйшай матэматыкі можам бадай дакладна вылічыць, што ў першыя стагоддзі ў пекле магло быць усяго некалькі тысяч грэшных душ, а цяпер каля 25 689 000 000 000.

Між тым колькасць чарцей, якія павінны абслугоўваць пекла, засталася тая самая, што і спачатку. Згодна з падлікамі духоўных спецыялістаў, чарцей у пекле 1 405 928 галоў – ні больш ні менш. Ды, апрача таго, 72 тысячы чартоўскіх князёў, графоў, баронаў ды іншых арыстакратаў.

Гэта значыць, што калі раней аднаму чорту прыходзілася мардаваць, скажам, 10 грэшнікаў, то цяпер ужо на яго долю прыпадае 17 300 000!

Ды з такой нагрузкай сам чорт шыю сабе зломіць!” [2].

Ад рэзкага напłыву грэшнікаў і чэрці, і Харон стаміліся. Праца кіпіць, цягнікі ў пекле няспынна ідуць, душы едуць па месцах апошняга спачыну. Пекла ў казцы Я. Маўра прыведзена, так бы мовіць, у стэрыльны стан, падобны да лепшых медыцынскіх устаноў – тут чысценька, прыгожа, акуратна. Пакуты людскія – гэта ўсяго толькі праца, слугі д’ябальскія ніякіх асаблівых адмоўных эмоцый да грэшнікаў не адчуваюць. Ды і паняцце граху набывае ў творы цалкам супрацьлеглае біблейскаму значэнне, што адпавядае ідэйным крытэрыям эпохі.

У аповесці В. Ластоўскага “Лабірынты” ідзе гаворка пра адзін з містычных выпадкаў з жыцця апавядальніка: падарожжа па падземнай бібліятэцы-лабірынце пад Верхнім полацкім замкам. Галоўны герой прыязджае ў горад па запрашэнні старшыні краязнаўчай суполкі Івана Іванавіча. Далучыўшыся да “любіцеляў старасвеччыны”, ён уступае ў дыскусію пра духоўную спадчыну беларускай культуры. Між тым, адзін з удзельнікаў суполкі, так званы Падземны чалавек, адзначае: “Там, у Богіне, ёсць такжа падземныя хады, як і ў нас, пад Верхнім замкам, у сярэдзіне гары. Старая веда і старая культура не загінулі. Кажуць людзі, а хто ж ведае, ці ёсць у гэтым хоць кропля праўды, пад Верхнім замкам, за магілай невядомага валадара, ёсць склады з багаццямі вялікімі. Кажуць, у абход абшырнай грабніцы, направа, ёсць мураваны праход крокаў 60 даўжыні,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і праз яго ўходзіцца ў сховы са старымі кнігамі. Часцю пісаны яны на дасочках, часцю на бяроставых пластках. Зложаны кнігі ў каваных серабром скрынях, усярэдзіне абітых скурай. З гэтай кніжні пракавечнай ёсць ход у скарбец... Толькі дужа страшна ісці там" [3]. Падземны чалавек прапануе галоўнаму герою прайсці да лабірынта, але, каб патрапіць унутр, неабходна даць клятву: "Акром мяне, з жывых ніхто не ведае аб гэтым ходзе. Ты другі будзеш ведаць аб ім і перадасі патомным. Але перш чым увайсці ў тайныя ходы, у якіх нашы празорлівыя прадзеды захавалі не толькі свае культурныя, але і вялікія матэрыяльныя багацці, ты павінен даць абяцанне, злажыць прысягу на вечную тайну" [3].

Лабірынт – гэта не толькі фізічная, але і метафізічная прастора, гэта не проста месца дзеяння, а ў некаторым сэнсе гэта ключ да разгадкі сэнсу твора, своеасаблівая формула, якая звязвае тэкстуальнае і пазакантэкстуальнае. Лабірынт у творы з'яўляецца своеасаблівым пераходам ад рэчаіснасці да ірэальнага свету, у які складана трапіць. У цэнтры гэтай містычнай прасторы захавана таямніца, якую неабходна разгадаць. Увайшоўшы ў падземныя лёхі, герой можа памерці ці заблукаць і назаўсёды застацца ў замкнёным лабірынце, стаць яго часткай. Нешта падобнае адбываецца і ў чыстцы – месцы паміж пеклам і раем. Герой В. Ластоўскага апынуўся ў своеасаблівым палоне містычнай бібліятэкі: яна знаходзіцца ў поўным распараджэнні героя, аднак яму не належыць; герой можа знаёміцца з любым выданнем і рукапісам, але толькі ў бібліятэцы. Першая яго вандроўка туды становіцца і апошняй.

Падагульняючы ўсё вышэйсказанае, адзначым, што выкарыстанне матыву інфернальнай вандроўкі ў літаратурных творах мае розныя функцыі. У казцы Я. Маўра "Падарожжа ў пекла" юнакі трапляюць у замагільны свет з уласнай волі. Паколькі твор адрасаваны дзецям, то незвычайнае падарожжа герояў служыць тут выхаваўчым і атэістычным мэтам, сфармуляваным згодна з ідэалогіяй эпохі. Адметна, што існаванне самога пекла не адмаўляецца аўтарам, але цалкам мяняецца зместавае напаўненне гэтай прасторы, якая падаецца ў сатырычным святле. У аповесці "Лабірынты" В. Ластоўскага дамінуе містычны элемент. Прыгоды галоўнага героя да самага фіналу трымаюць чытача ў напружанасці. Інфернальная вандроўка ў творы дазваляе пісьменніку глыбока раскрыць нацыянальную праблематыку. У абодвух творах матыў фантастычнага падарожжа звязаны са зваротам да міфалогіі.

**Літаратура**

1 Васючэнка, П. Трансцэндэнтальнае падарожжа Мацея Бурачка / П. Васючэнка // Першацвет. – 1999. – № 7–8. – С. 43–45.
2 Маўр, Я. Падарожжа ў пекла [Электронны рэсурс] / Я. Маўр. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Janka_Maur/Padarozza_u_ piekla.html#chapter2. – Дата доступу: 14.04.2023.
3 Ластоўскі, В. Лабірынты [Электронны рэсурс] / В. Ластоўскі. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Vaclau_Lastouski/ Labirynty.html. – Дата доступу: 14.04.2023.

**УДК 821.161.3-311.6*В.Быкаў**

***К. В. Якаўленка***

## ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ Ў ВАЕННАЙ ПРОЗЕ ВАСІЛЯ БЫКАВА: НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦІ "ТРЭЦЯЯ РАКЕТА"

*Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы выбару ў ваеннай прозе В. Быкава. Аналізуюцца паводзіны герояў аповесці "Трэцяя ракета" ў экстрэмальных умовах, калі*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ